

ЛЕГЕНДА КРЫМІНАЛЬНАГА ВЫШУКУ **4**

БУДУЧЫНЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КІНАСТУДЫІ **9**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ВЕРАСНЯ 2018 г. СУБОТА № 188 (28804)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Міністэрства аховы здароўя бачыць сваёй мэтай развіццё ў раёнах міжрэгіянальных цэнтраў. Гэта магчымасць канцэнтраваць высокатэхналагічнае абсталяванне, прафесійныя кадры, тым самым аказваць якасную дапамогу найбольшай колькасці насельніцтва. Гэта мэтазгодна эканамічна, важна і для саміх людзей, якія атрымліваюць дапамогу побач з месцам жыхарства. Такія цэнтры ёсць у кожнай вобласці. У першую чаргу работы вядуцца там, дзе неабходна павелічэнне аб'ёмаў аказання медыцынскай дапамогі, і таксама там, дзе мы абавязаны палепшыць умовы знаходжання пацыентаў».*

# СІЛА — У АДЗІНСТВЕ

Прэзідэнт узяў удзел у саміце СНД



Фота БелТА.

**Самалёт беларускага лідара прызямліўся ў Душанбэ вечарам 27 верасня. У аэрапорце яго сустракалі прэм'ер-міністр Таджыкістана Кахір Расулзада, мэр Душанбэ Рустам Эмамалі і першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта СНД Віктар Гумінскі.**

Учора кіраўнік беларускай дзяржавы ўзяў непасрэдны ўдзел у саміце. На высокай сустрэчы Прэзідэнт Беларусі заклікаў да адзінства і сумесных дзеянняў унутры СНД на фоне разбурэння існуючай сістэмы міжнароднага гандлю. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: нязменным прыярытэтам членства Беларусі ў СНД застаецца ўмацаванне эканамічнага супрацоўніцтва. Паводле яго слоў, пры гэтым з падачы Захаду безапеляцыйна, у аднабаковым парадку руйнуецца сістэма міжнароднага гандлю, якая стваралася дзесяцігоддзямі, а выкарыстанне неправавых механізмаўператвараецца ў норму і ставіць нашы эканомікі ў слабае становішча.

«Толькі разам мы зможам паспяхова супрацьстаяць гэтым новым выклікам. З аднаго боку, мы павінны аб'яднаць намаганні для сумеснай абароны інтарэсаў на глабальным рынку, — звярнуў увагу беларускі лідар. — З іншага — актывізаваць узаемны гандаль і інвестыцыі, пашыраць прамысловую кааперацыю. У цэлым — адказаць кансалідацыяй і павышэннем ролі Садружнасці як рэгіянальнага гульца».

**СТАР. 2**

## КОРАТКА

● **На Нежынскім горна-абагачальным камбінаце завяршылася дастаўка першага з двух стволапраходных SBR-комплексаў. З прычыны вялікіх габарытаў машыны (вага SBR каля 400 т) транспарціроўка грузу выконвалася па частках на 42 фурах.**



● У Беларусі ўпершыню выканана паўторная перасадка сэрца. Мужчыну, якому яна спатрэбілася, упершыню выканалі трансплантацыю ў 2013 годзе. Увесь гэты час ён жыў паўнавартасным жыццём, працаваў.

● **З Кіева ў першы рэйс 28 верасня выйшаў новы цягнік чатырох сталіц № 31/32 Кіеў — Мінск — Вільнюс — Рыга.**

● Мінчане могуць даведацца дату ўключэння ацяплення ў кватэрах анлайн.

ISSN 1990 - 763X

■ Сацыяльны клопат

# У ІНТАРЭСАХ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Старасць называюць залатым часам, і восень, як вядома, таксама называюць залатой парой. Можа, таму ў самы разгар восеньскага сезона 1 кастрычніка ва ўсім свеце адзначаецца Дзень пажылога чалавека. Сёлета свет будзе святкаваць ужо 28-ы Дзень пажылога чалавека, наша краіна — 26-ы.**



Фота БелТА.

Беларусь адносіцца да ліку старэючых нацый. На пачатак года ў краіне пражывалі 2 млн 377 тысяч чалавек, старэйшых за працаздольны ўзрост, у іх ліку 696 тысяч мужчын і 1 млн 681 тысяча жанчын.

Удзельная вага пажылых сярод насельніцтва Беларусі складае 25,1 %. У сельскай мясцовасці гэты паказчык вышэйшы — 32 %, у гарадах — 23,1 %. Пры гэтым на 1 тысячу мужчын, старэйшых за працаздольны ўзрост, у Беларусі прыходзіцца 2,4 тысячы жанчын.

Таксама па стане на 1 ліпеня ў Беларусі пражывалі 396 чалавек, старэйшых за 100 гадоў, у тым ліку 41 мужчына і 355 жанчын.

**СТАР. 2**

■ Аматарам вышыні

# ПАЛЁТ НАД ГРОДНАМ

Паветраны турызм карыстаецца попытам па ўсёй краіне

**Новы атракцыён стаў неад'емнай часткай на розных гарадскіх святах. Не так даўно скарысталіся магчымасцю здзейсніць палёт на верталёце каля 1,5 тысячы гродзенцаў і гасцей горада. Ахапіць такую колькасць аматараў адрэналіну пілоты змаглі за тыдзень — менавіта столькі МІ-2 баразніў паветра над горадам. Такі працяглы тэрмін палётаў у Гродне быў здзейснены ўпершыню. Каб убачыць Гродна з вышыні, да МІ-2 збіраліся вялікія чэргі.**

Паветраная вандроўка становіцца новым атракцыёнам на гарадскіх святах, расказваюць супрацоўнікі Віцебскага аэраклуба. І калі раней такія экскурсіі праходзілі адзін дзень, то паступова пілоты затрымліваліся ў гарадзе, які іх запрашаў, на два альбо тры дні. Палёты падчас святкавання 890-гадовага юбілею Гродна доўжыліся цэлы тыдзень і сталі для пілотаў своеасаблівым рэкордам.

Многія прыходзілі, каб здзейсніць даўнюю мару — убачыць горад з вышыні птушынага палёту. Самымі напружанымі для пілотаў сталі выхадныя падчас свята горада. У адзін з такіх дзён пракацілася каля 350 чалавек. Раз-пораз удзельнічалі новыя пасажыры: моладзь, бацькі з дзецьмі, пенсіянеры. Работнікі аэраклуба расказалі, што самаму малому было тры гады, а сярод сталых — 80-гадовая гродзенка, якая прыйшла з унучкай.

Палёт доўжыўся каля пяці хвілін і адбываўся на вышыні 400 метраў. Месца старту размясцілі каля гандлёвага цэнтра.

**СТАР. 3**

# СІЛА — У АДЗІНСТВЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Прэзідэнта, зараз у членаў СНД адсутнічае агульнае бачанне і генеральны план развіцця Садружнасці, практычная стратэгія па інтэграцыі эканомік краін-удзельніц не створана. Ён нагадаў, што ў рамках адаптацыі Садружнасці да сучасных рэалій прыступілі да рэвізіі Канцэпцыі далейшага развіцця СНД. Кіраўнік беларускай дзяржавы прапанаваў даручыць урадам абнавіць у гэтым дакуменце эканамічны блок, паколькі ён можа стаць ідэалагічнай асновай для больш поўнага выкарыстання навукова-вытворчага і інвестыцыйнага патэнцыялу.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што ўзаемадзеянне ў фармаце СНД павінна быць сінхранізавана з інтэграцыйнымі працэсамі ў Вялікай Еўразіі, асабліва ў рамках Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, а таксама з Еўразійскім эканамічным саюзам. Паводле яго слоў, варта вызначыць напрамкі для спалучэння магчымасцяў нашых краін з буйнымі міжнароднымі праектамі, у першую чаргу з эканамічным поясам Шаўковага шляху.

Яшчэ беларускі лідар прапанаваў даручыць выканаўчаму сакратару СНД Сяргею Лебедзеву і старшыні Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Тыграну Саркісяну актывізаваць падрыхтоўку да падпісання абноўленага мемарандума аб паглыбленні ўзаемадзеяння паміж ЕЭК і Выканкамам СНД.

Дарэчы, падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД Аляксандр Лукашэнка запрасіў замежных лідараў наведаць ІІ Еўрапейскія гульні, якія пройдуць у Мінску з 21 па 30 чэрвеня 2019 года.

Таксама на палях саміту кіраўнік беларускай дзяржавы правёў шэраг двухбаковых сустрэч з замежнымі лідарамі. У аб'ектывы камер трапіла сустрэча з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам. Абмеркавалі стан гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэалізацыю ранейшых дамоўленасцяў і перспектыўныя напрамкі для развіцця ўзаемадзеяння.

Па выніках Аляксандр Лукашэнка коратка пагутарыў з прадстаўнікамі расійскага тэлебачання і распавёў, што пытанне бяспекі было цэнтральным на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, асабліва гэты аспект Прэзідэнт абмеркаваў з Уладзімірам Пуціным. Ён дадаў, што ў сферы бяспекі ўплываюць і іншыя фактары, у тым ліку ваенныя.

**Паводле БелТА.**

# ЭКАНОМІКА, БЯСПЕКА І РАЗВІЦЦЁ

**На тры гэтыя пастулаты зрабіў акцэнт міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ на пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў СНД у Душанбэ.**

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі нагадаў, што два гады таму на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў было прынята важнае для далейшага развіцця Садружнасці рашэнне аб яе адаптацыі да сучасных рэалій. На яго думку, сёння можна з задавальненнем канстатаваць, што фактычна ўсе пастаўленыя задачы выкананы альбо знаходзяцца ў актыўнай стадыі завяршэння.

Адной з ключавых тэм з'яўляецца работа над актуалізацыяй канцэпцыі далейшага развіцця СНД, дадаў ён. Паводле слоў Уладзіміра Макея, гэта асноватворны дакумент, рэфармаванне арганізацыі распачата. «Безумоўным прыярытэтам Беларусі ў далейшым развіцці інтэграцыі застаецца эканоміка пры разуменні важнасці супрацоўніцтва і па іншых напрамках», — падкрэсліў міністр замежных спраў Беларусі.

Па тэме бяспекі кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі зазначыў наступнае: гэтыя пытанні актуальныя для многіх краін, і гэта праблемы, ад якіх не сысці. «Не толькі на поўдні прасторы СНД, але і на заходніх межах адбываецца назапашванне ваеннага патэнцыялу. Некаторыя краіны, якія мяжуюць непасрэдна з Беларуссю, прапануюць нават велізарныя грошы за тое, каб іх заакіянскія саюзнікі размяшчалі свае ваенныя базы. Вядома ж, мы ўсё гэта павінны ўлічваць у нашай палітыцы і прымаць меры адэкватнага рэагавання», — сказаў Уладзімір Макей.

Таксама міністр замежных спраў распавёў аб будучых прадстаўнічых міжнародных канферэнцыях у сталіцы Беларусі, якія звязаны з тэматыкай бяспекі.

Ён дадаў, што парадак дня арганізацыі павінен быць больш спалучаны з парадкамі дня розных міжнародных структур, якія займаюцца рашэннем актуальных праблем і выклікаў.

Так, сустрэчу асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі па бяспецы ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада ў Мінску наведаюць прадстаўнікі краін, якія маюць уласны пункт гледжання, які адрозніваецца ад іншых. Аднак, дадаў Уладзімір Макей, задача заключаецца ў тым, каб даводзіць свой пункт гледжання, не баяцца падобнага роду дыскусій.

Дарэчы, СМЗС праходзіла на фоне работы сесіі Генасамблеі ААН, дзе адной з ключавых тэм было садзейнічанне паступальнаму эканамічнаму росту і ўстойліваму развіццю. Міністр выказаў упэўненасць у тым, што нашым краінам пад сілу прадэманстраваць рэальнае партнёрства ў справе выканання Парадку дня — 2030 і дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Яшчэ ён прапанаваў падумаць, як выкарыстоўваць фармат СНД для садзейнічання глабальным намаганням у галіне ўстойлівага развіцця.

**Паводле БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Мінфін Грэцыі адмяніў абмежаванні на зняцце наяўных




Яны былі ўведзены ў 2015 годзе, перадае ТАСС. З 1 кастрычніка дазваляецца без абмежаванняў зняцце наяўных сродкаў у краіне. Акрамя таго, грэкам дазваляецца зняцце сродкаў са сваіх рахункаў у фінансавых установах за мяжой на суму да 5 тысяч еўра ў месяц. З 3 тысяч да 10 тысяч еўра павялічваецца сума, дазволеная для вывазу за мяжу. Абмежаванні на рух капіталу былі ўведзены тры гады таму ў сувязі з вострым фінансавым крызісам і панікай насельніцтва, якое пачало масава здымаць грошы з рахункаў. З тых часоў урад неаднаразова павышаў месячны ліміт на зняцце наяўных грашовых сродкаў з рахункаў у грэчаскіх банках. Апошнім часам жыхарам дазвалялася здымаць па 5 тысяч еўра ў месяц, але ўрад палічыў, што такое абмежаванне ўжо бессэнсоўнае, паколькі перавышае патрэбы большасці грамадзян у атрыманні наяўных на працягу месяца.

### Ілона Маска абвінавачваюць у махлярстве

Камісія па каштоўных паперах і біржах ЗША звярнулася ў федэральны акругоўы суд Манхэтэна з абвінавачваннямі супраць заснавальніка кампаніі Tesla Ілона Маска. Мільярдэра абвінавачваюць у махлярстве ў сувязі з яго твітамі аб магчымасці выкупіць акцыі Tesla, зрабіўшы тым самым кампанію непублічнай. Па звестках рэгулятара, на самай справе заснавальнік кампаніі не абмяркоўваў і не пацвярджаў умовы продажу, тым самым прычыніўшы шкоду інвестарам. Ілон Маск назваў іск неабгрунтаваным і заявіў, што дзеянні камісіі «глыбока расчаравалі» яго. Як вядома, 7 жніўня Маск напісаў у сваім «Твітэры», што збіраецца выкупіць Tesla па цане 420 долараў за акцыю, дадаўшы пры гэтым, што «фінансаванне забяспечана». Праз 17 дзён ад гэтых планаў ён адмовіўся.



### У Мікранезіі пасажырскі самалёт упаў у ваду



У Мікранезіі Boeing 737, на борце якога знаходзіліся 36 пасажыраў, здзейсніў аварыйную пасадку на ваду. Пра гэта паведаміла мясцовая газета Pacific Daily News са спасылкай на кіраўніцтва аэрапорта. Пасажырскі самалёт ляцеў рэйсам з Папуа — Новай Гвінеі на астравы Трук. Паведамляецца, што Boeing паспрабаваў сесці, але зваліўся ў ваду прыкладна за 150 метраў ад узлётна-пасадачнай паласы. Кіраўнік аэрапорта мікранезійскага штата Трук Джымі Эмілія заявіў, што ўсе 36 пасажыраў і 11 членаў экіпажа прайшлі агляд у дактароў, аднак сур'ёзных траўмаў не выяўлена.

## Фінансавая аналітыка

# Рызыкі для долара. Палітычнага характару

### Гульня ў «імпічмент» наўрад ці пойдзе «вечна зялёнаму» на карысць

**Па выніках чарговага пасяджэння Федэральная рэзервовая сістэма (ФРС) ЗША абвясціла аб павышэнні ключавой стаўкі з 2 % да 2,25 %. Акрамя таго, ФРС агучыла вельмі пазітыўны прагноз у частцы эканамічнага росту, беспрацоўя і інфляцыі. Гэта ўжо трэцяе павышэнне ключавой стаўкі ў гэтым годзе, і рынкі чакаюць, што ў снежні адбудзецца яшчэ адно, чацвёртае, лагічна разважае фінансавы аналітык Жанна КУЛАКОВА.**

Той факт, што рэальнасць можа стаць лепшая за прагноз, ужо шмат месяцаў аказвае долару падтрымку. Аднак цяперашняе павышэнне не стала для інвестараў сюрпрызам, фактычна яно ўжо было ўлічана ў бягучым курсе долара, таму на навіны амерыканская валюта адрэагавала сціплым умацаваннем на 0,5 %.

Разам з тым для долара ёсць і рызыкі, галоўным чынам палітычнага характару. У пачатку лістапада ў ЗША пройдуць так званыя прамежкавыя выбары, падчас якіх будзе цалкам пераабірацца ніжняя палата Кангрэса, 35 сенатараў, некалькі дзясяткаў губернатараў і іншыя чыноўнікі. Галоўная інтрыга: ці застануцца пры ўладзе рэспубліканцы або іх зменяць дэмакраты? У другім выпадку, верагодна, тая партыя будзе гуляць супраць дзеючага прэзідэнта, і ў СМІ зноў можа замаячыць слова «імпічмент». Наўрад ці гэта пойдзе долару на карысць.

Акрамя таго, сам прэзідэнт Трамп з'яўляецца прыхільнікам слабай нацыянальнай валюты і актыўна выкарыстоўвае вербальныя інтэрвенцыі, накіраваныя супраць яе росту. Напрыклад, публічна выказвае незадаволенасць палітыкай рэзервовай сістэмы і моцным доларам. Нярэдка рынкі рэагуюць на такія заявы распродажам долара, і амерыканская валюта слабее.

Таксама трэба памятаць пра палітычнае супрацьстаянне паміж ЗША і шэрагам іншых дзяржаў, у прыватнасці Кітаем. КНР з'яўляецца найбуйнейшым трымальнікам амерыканскіх дзяржаўных аблігацый, а аперацыі з гэтымі паперамі могуць быць інструментам уплыву на курс амерыканскай валюты. Так, маштабны распродаж такіх аблігацый можа справакаваць падзенне «баксаў».

З улікам усіх фактараў перспектывы долара цяжка ахарактарызаваць як адназначна добрыя, нягледзячы на тое, што павышаюцца працэнтныя стаўкі.

**Сяргей КУРКАЧ**

# У ІНТАРЭСАХ ПАЖЫЛЫХ ЛЮДЗЕЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як расказаў журналістам **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК**, па апошніх даных, 90,1 % непрацаздольных пажылых беларусаў атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома. Сацыяльныя работнікі абслугоўваюць дома 30,5 % пажылых людзей ва ўзросце да 75 гадоў, 24,8 % — ад 75 да 80 гадоў і амаль палову — 44,7 % ва ўзросце 80 гадоў і старэй. З іх 26 % — адзінокія грамадзяне.

Аказанне сацыяльных паслуг, паводле слоў Аляксандра Румака, дыферэнцыравана. Бясплатна іх атрымліваюць адзінокія малазабяспечаныя грамадзяне, чый памер пенсіі меншы за бюджэт пражытачнага мінімуму, — гэта каля 2 % ад агульнай колькасці пажылых людзей, якія атрымліваюць сацыяльныя паслугі дома. Пажылыя людзі, якія маюць даход ад 1 да 2 бюджэтаў, аплачваюць каля 60 % ад кошту сацпаслуг. Тым пажылым, якія маюць дзяцей працаздольнага ўзросту, што абавязаны ўтрымліваць бацькоў па законе, сацыяльныя паслугі дома аказваюцца на ўмовах поўнай аплаты.

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны асабліва адзначае той факт, што ў нашай краіне пашыраецца кола сацыяльных паслуг, якія дазваляюць чалавеку даўжэй жыць у звыклых хатніх умовах. Калі раней адкрывалі аддзяленні дзённага знаходжання, дзе людзі маглі займацца клубнай і гуртковай дзейнасцю, то цяпер такія аддзяленні прызначаны і для аказання дапамогі сем'ям у доглядзе пажылых.

**Калі пачынаецца старасць?**

Сусветная арганізацыя аховы здароўя распрацавала наступную ўзроставую класіфікацыю:
да 40 гадоў — малады ўзрост;
да 60 гадоў — сярэдні ўзрост;
60—75 гадоў — пажылыя людзі;
75—90 гадоў — старыя людзі;
пасля 90 гадоў — доўгажыхары.

* * *

У Беларусі створана 13 замяшчальных сем'яў для пажылых людзей. У лідарах — Мінская вобласць, дзе з'явілася сем такіх сем'яў. Замяшчальная сям'я — гэта арганізацыя сацыяльнага абслугоўвання пажылых людзей ва ўмовах іх сумеснага пражывання з тымі, хто гатовы ўзяць на сябе клопат аб прадстаўніках старэйшага пакалення. «Часцей за ўсё пажылых бяруць у іншыя сем'і дарослыя людзі, якія выгадавалі сваіх дзяцей, каб разам жыць і весці агульную гаспадарку», — заявіў Аляксандр Румак. Ён адзначыў, што калі пажылому чалавеку неабходны пастаянны догляд, то ў такіх выпадках замяшчальнай сям'і можа быць прызначана выплата.

* * *

У Беларусі плануецца распрацаваць Нацыянальную стратэгію ў інтарэсах пажылых людзей. Па словах Аляксандра Румака, НДІ працы Мінпрацы і сацабароны прыступіць да распрацоўкі гэтага дакумента ў 2019 годзе. Стратэгія павінна будзе прадугледжваць меры па рэалізацыі патэнцыялу пажылых людзей, задавальнення іх патрэб у розных сферах жыцця.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Новыя традыцыі

# ХТО ВЯДЗЕ КАМАНДУ

## Прайшоў першы конкурс прафесійнага майстэрства сярод кіраўнікоў устаноў адукацыі Гродзенскай вобласці

**Выбіралі лепшых кіраўнікоў устаноў сярэдняй, дашкольнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Па папярэдніх выніках, у фінал выйшлі па дзевяць канкурсантаў у кожнай намінацыі. У суперфінале засталіся толькі чатыры. А яго пераможца яшчэ не названы.**

Кожны кіраўнік — удзельнік конкурсу — мае значныя напрацоўкі ў сваёй рабоце. Дасягненні сваёй навучальнай установы фіналісты агучылі падчас прэзентацыі. Таксама ўдзельнікі конкурсу выступілі з абаронай бізнес-плана па развіцці пазабюджэтнай дзейнасці, знаходзілі выйсце з сітуацый, якія патрабуюць нестандартных рашэнняў у пытаннях аховы працы, псіхалогіі, педагогікі, заканадаўства.

Конкурс стаў сапраўдным майстар-класам для кіраўнікоў. Па словах прадстаўнікоў Гродзенскага абласнога інстытута адукацыі, гэты вопыт карысны для многіх прысутных і будзе ўкараняцца, напрыклад, анлайн-школа, дзе кожны настаўнік можа трымаць сувязь з бацькамі і вучнямі праз свой сайт. Важнасць такога кірунку адзначылі і ўдзельнікі конкурсу, якія атрымалі магчымасць пазычыць новыя ідэі ў калег. «Гэта свайго роду ўрок практыкі для кіраўнікоў адукацыі», — зазначыла **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Галіна КУРГАНСКАЯ.**




Па выніках конкурсу вызначыліся чатыры пераможцы. Гэта дырэктар лідскай СШ № 1 Сяргей Фонасаў, кіраўнік дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці № 98 г. Гродна Святлана Федарцова, дырэктар гродзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Сняжана Пекарскенэ і дырэктар гродзенскага прафесійнага ліцэя будаўнікоў № 1 Алена Жалезняковіч. Імя галоўнага суперфіналіста будзе названа падчас «Педагагічнага балю», які сёлета пройдзе ў Шчучыне і прымеркаваны да Дня настаўніка.

**Маргарыта УШКЕВІЧ** ■

# ПАЛЁТ НАД ГРОДНАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У горадзе не так проста знайсці адпаведнае месца для стартаў, — адзначыла **начальнік службы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Віцебскага аэраклуба Вольга БУГАЕВА.** — Тут шмат абмежаванняў, і мы гэта ўсё ўлічваем, інакш не атрымалі б дазвол.

Каб адправіцца ў паветранае падарожжа, многія чакалі і гадзіну, і дзве. Часам чарга налічвала да ста чалавек. Іх трываласць акупалася новымі незвычайнымі эмоцыямі і ўзрушаным станам.

— Некаторыя сумняваліся: ляцець ці не? Яны прыйшлі са знаёмымі, каб проста паназіраць, але ў апошні момант усё ж такі вырашалі ляцець, — расказвае суразмоўніца.

Дарэчы, палёты, якія падабаюцца аматарам адрэналіну, даюць магчымасць палепшыць матэрыяльную базу аэраклуба, адзначылі арганізатары. А яшчэ садзейнічаюць падрыхтоўцы курсантаў для лётнага факультэта і спартсменаў верталётнага спорту. Аэраклубу ўдалося захаваць сваю базу і методыку работы, што дазваляе і цяпер паказваць добрыя вынікі на чэмпіянатах па верталётным спорце. У той жа час гэта патрабуе значных сродкаў, але аэраклуб абыходзіцца без датацый. Усе нормы эксплуатацыі тэхнікі строга кантралююцца.

— Верталёт, які здзяйсняе палёты, сертыфікаваны, у тым ліку і па шуме. Ён налятаў усяго тры тысячы гадзін, гэта менш чым трэцяя частка агульнага рэсурсу. Верталёт спісваецца, калі яго вылеты складаюць 10,5 тысячы гадзін. Да таго ж ён не выкарыстоўваўся ў агрэсіўным асяроддзі — не быў на хімработах і не падвяргаўся перападам тэмпературы, — адзначыла Вольга Бугаева.

Паветраны шпацыр вядомы ва ўсіх райцэнтрах Віцебшчыны. Уздымаў верталёт аэраклуба паветраных турыстаў у Брэсце, Баранавічах, Салігорску... Некалькі дзён «завісаў» над Лідай і цэлы тыдзень — над Гродам. У дзень адбывалася і па 50 палётаў. Аднак усіх ахвотных не давялося ахапіць, адзначылі арганізатары, бо з кожным разам аматараў паветранага турызму становіцца ўсё больш.



**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

■ Свята ўраджаю

# ГІМН ХЛЕБУ

## У Верхнядзвінску Віцебшчына адзначыла абласныя «Дажынкі»

**Традыцыя адзначаць свята сведчыць пра велізарную ролю сельскагаспадарчай галіны ў сацыяльна-эканамічным развіцці дзяржавы. Пра гэта, у прыватнасці, заявіў на абласных «Дажынках» старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА. Віцебшчына, па словах спікера парламента, падрыхтавала добрую базу для развіцця аграпрамысловага комплексу ў 2019 годзе.**

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што гэты год быў не зусім удалы для працаўнікоў вёскі. «Тым не менш Віцебская вобласць па валавым зборы прадукцыі сельскай гаспадаркі выйдзе вышэй за ўзровень мінулага года. Безумоўна, зерне з'яўляецца базавым паказчыкам, але, акрамя таго, ёсць і жывёлагадоўля. Мяса атрымана ў вобласці больш, выкананы дзяржзаказ па здачы збожжа, значна больш нарыхтавана кармоў. Значыць, зроблена добрая база для развіцця ў наступным годзе», — сказаў Уладзімір Андрэйчанка.



Фота БелТА

Па словах **старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСНЁВА,** акцэнты ў развіцці сельскагаспадарчай галіны рэгіёна зроблены па некалькіх ключавых кірунках. «Яшчэ адна аграрная дамінанта — зрабіць гэтую сферу для кожнага працуючага прэстыжнай, а ў грамадстве — паважанай», — лічыць губернатар. І фарміраваць станоўчую матывацыю да прафесіі хлебароба трэба пачынаць яшчэ са школьнай парты, перакананы Мікалай Шарснёў. Дарэчы, у Віцебскай вобласці з гэтай мэтай з пачатку навучальнага года ў многіх раёнах былі адкрыты аграрныя класы.

Старшыня аблвыканкама павіншаваў усіх працаўнікоў вёскі са святам. «Сённяшняя ўрачыстасць — своеасаблівы гімн хлебу, даніна прызнання заслуг тых, хто яго вырошчвае і збірае. Толькі хлебаробы ведаюць сапраўдную цану ўкладзенай у зямлю працы», — падкрэсліў Мікалай Шарснёў ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ЛЁТЧЫКІ АДПРАВЯЦЦА НА ЎСХОД

**З 1 кастрычніка да 2 лістапада на тэрыторыі Расіі, Казахстана, Узбекістана і Таджыкістана пройдзе вучэнне Арганізацыі дагавора аб калектыўнай бяспецы. У ім будзе задзейнічана і ваенна-транспартная авіяцыя Беларусі. Пра гэта заявіў начальнік Аб'яднанага штаба АДКБ Анатоль СІДАРАЎ.**

Састаўной часткай вучэнняў будзе вучэбная аперацыя «Паветраны мост» з выкарыстаннем калектыўных авіяцыйных сіл АДКБ. Акрамя таго, ад Беларусі ў вучэнні прымуць удзел міратворчыя падраздзяленні. Да іх далучацца часткова баявыя падраздзяленні, якія ўваходзяць у склад Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Афіцэры ж з Беларусі будуць удзельнічаць у камандаванні Калектыўнымі сіламі аператыўнага рэагавання і міратворчымі сіламі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

### У БДУІР — ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

**Пакуль шчаслівыя першакурснікі толькі асвойваюцца ў сваёй новай ролі, барацьба за ўвагу новых абітурыентаў ужо завязалася.**

І галоўны IT-універсітэт краіны не дрэмле: 30 верасня ў БДУІР пройдзе першы Дзень адкрытых дзвярэй. Гэта выдатная магчымасць убачыць ВНУ знутры і вызначыцца з выбарам будучай спецыяльнасці. Перад абітурыентамі выступяць дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедраў і паспяховыя выпускнікі ўніверсітэта. Яны раскажуць пра ўсе нюансы паступлення, арганізацыю навучальнага працэсу, магчымасці працаўладкавання пасля заканчэння ўніверсітэта і адкажуць на пытанні абітурыентаў.

Ва ўсіх вучэбных карпусах мерапрыемства стартуе ў 10 гадзін раніцы. Больш падрабязную праграму на кожным факультэце і інфармацыю па размяшчэнні вучэбных карпусоў можна знайсці на сайце БДУІР.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### У ЗАРЭЧЧА — НАВЕЧНА

**Дваццаць сем жыхароў вёскі Зарэчча Пружанскага раёна загінулі на франтах былой вайны. Яны пахаваны ў розных мясцінах — ад Расіі да Еўропы. Але дзякуючы іх земляку, які нарадзіўся праз многа гадоў пасля ваенных падзей, іх імёны сышліся разам у адным мемарыяле, як напамін нашчадкам пра жахі вайны, пра подзвіг дзядоў і прадзедаў.**

Ураджэнец названай вёскі, а цяпер паспяховы прадпрымальнік Міхаіл Куц, вырашыў малой радзіме яшчэ і дапамагчы не знікнуць з карты краіны. Там цяпер застаецца зусім няшмат сталых жыхароў, і вёска з гэтай прычыны паступова пераходзіць у разрад неперспектыўных, значыць, становіцца кандыдатам на знікненне. А цяпер яна будзе месцам збору землякоў на памятныя мерапрыемствы, увойдзе ў турыстычныя маршруты.

Выхадзец з Зарэчча пабудаваў помнік, які складаецца з 27 мемарыяльных дошак з партрэтам кожнага, хто не вярнуўся з вайны. Дошкі ўстаноўлены ў скверы, які перад гэтым добраўпарадкавалі. Праект абышоўся бізнесмену прыкладна ў 15 тысяч долараў. Увасобіць ідэю ў жыццё дапамагалі многія землякі Міхаіла Куца. А на адкрыццё ў мінулую суботу прыехала з розных краін каля 200 чалавек, чые карані ў гэтых мясцінах. Прадпрымальнік выказаў намер пабудаваць другую чаргу помніка роднай вёсцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### НОЧ У СТАЛІЦЫ СТАНЕ ЦВЯРОЗАЙ

**Мінгарвыканкам прыняў рашэнне абмежаваць у Мінску ў начны час продаж алкагольных напояў.**

Згодна з прынятым дакументам, абмежаванне будзе дзейнічаць з 1 кастрычніка гэтага года да 1 кастрычніка 2019 года. Продаж моцных алкагольных напояў, а таксама слабога алкаголю і піва будзе забаронены з 23.00 да 7.00.

Разам з тым адзначаецца, што абмежаванне па напоях не будзе дзейнічаць у кавярнях і рэстаранах пры рэалізацыі алкаголю на разлік.

**Сяргей КУРКАЧ.**

КРЫМІНАЛЬНАМУ ВЫШУКУ 100 гадоў

■ Асоба

# ЛЕГЕНДА КРЫМІНАЛЬНАГА ВЫШУКУ

**Мой суразмоўнік Анатоль Іванавіч САВІЦКІ — асоба без перабольшання легендарная. Ён пачаў сваю дзейнасць у 1991 годзе і прайшоў шлях ад оперупаўнаважанага да начальніка Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС.**
**Але грознага, як чакалася, уражання, Анатоль Іванавіч не выклікае. Наадварот, маладжавы, падцягнуты, што называецца, спартыўны мужчына, з адкрытай усмешкай, вельмі кантактны. І толькі погляд, уважлівы, востры, выдае ў ім чалавека, у якога за плячыма неардынарны жыццёвы вопыт і звычка імгненна ацэньваць чалавека.**

***— Анатоль Іванавіч, калі вы абралі сваю прафесію?***

— Было гэта ў 1984 годзе. Пасля службы ў арміі, у ПДВ, я прыйшоў на работу ў праваахоўныя органы. Тры з паловай гады адпрацаваў у ДАІ, затым паступіў у Вышэйшую школу міліцыі. Дарэчы, за час вучобы давялося пабываць у камандзіроўках у Нагорным Карабаху, у Арменіі. Пасля заканчэння вучобы ў 1991 годзе па размеркаванні пачаў працаваць у аддзеле крымінальнага вышуку Фрунзенскага раёна сталіцы. І потым ужо гэтай прафесіі не здрадзіў.

***— Раскажыце пра спецыфіку вашай тагачаснай службы.***

— У тыя часы занальнья супрацоўнікі крымінальнага вышуку займаліся расследаваннем усіх відаў злачынстваў. Гэта маглі быць кватэрныя крадзяжы, угон транспарту, махлярства і іншыя. Калі здарэнне адбылося на тваёй «зямлі», будзь добры, унікай, аказвай садзейнічанне або арганізуй раскрыццё. Даводзілася літаральна «вытоптваць» кожны эпізод. Работы было зашмат, таму што яна будавалася ў асноўным на апытанні насельніцтва. Галоўная ўвага, натуральна, удзялялася асобам, якія стаяць на ўліку ў органах унутраных спраў. Работа з імі была вельмі шчыльная, таму што большая частка злачынстваў раскрывалася менавіта дзякуючы асабістаму кантакту з гэтым няпростым кантынгентам.

Але, вядома, была ў кожнага і свая спецыялізацыя. У аддзеле хтосьці больш прадметна займаўся крадзяжамі, або ўгонам аўтамабіляў, або цяжкімі злачынствамі.

***— Якая спецыялізацыя прыцягнула вас?***

— У 1993 годзе я перайшоў старшым упаўнаважаным па асабліва важных справах на ўпраўленне крымінальнага вышуку Мінска па раскрыцці крадзяжоў аўтамотатранспарту. Угонаў аўтамабіляў у тыя гады як у сталіцы, так і ў краіне здзяйснялася велізарная колькасць. Трэба было прафесійна займацца іх раскрыццём. Якраз лінію паток іншамарак з-за мяжы, і час сам па сабе быў неспакойны. Уганемі аўтамабіляў, адным з самых прыбытковых промыслаў крымінальнага свету, займаліся, як правіла, злачынныя групы. І часта яны былі міжнародныя, вельмі высокага ўзроўню. Напрыклад, прыбываюць да нас спецыяліст з Расіі або з Прыбалтыкі. У яго з сабой усе прыстасаванні для ўскрыцця транспартнага сродку. Дзве-тры хвіліны, ён адчыняе любую машыну, садзіцца ў яе і з'язджае. Далей, па ланцужку, перадае яе наступнаму члену банды. Ролі ў іх былі дакладна размеркаваны. Адзін выглядвае аўтамабіль, другі ўганяе, трэці змяняе нумарныя агрэгаты,



чацвёрты рыхтуе дакументы, пяты прадае... Цэлая сістэма. Каб выкрыць падобную групу, праводзілася каласальная работа. Збіралі доказы па крупінках. Часам крадзеныя аўтамабілі затрымліваліся ў Польшчы. Але часцей за ўсё яны «ўсплывалі» ў Расіі. Па родзе сваёй дзейнасці я часта лётаў у Маскву, у Піцер, у Валгаград, у Іашкар-Алу. У канцы 1994 — пачатку 1995 амаль што «прапісаўся» ў Маскве, калі працавалі над расійска-прыбалтыйскаберуская злачыннай групай.

***— Цікавая была ў вас работа!***

— Так, ёсць свой інтарэс, ёсць нават азарт. Калі бачыш, што злачынцы нясуць абгрунтаванае пакаранне, што ёсць канчатковы вынік тваіх намаганняў, становіцца зразумела, для чаго працуеш, для чаго ўсё гэта робіцца.

***— 90-я былі няпростымі гадамі. Небяспечнымі, часта няўдзячнымі для супрацоўнікаў міліцыі. Не сакрэт, што многія сыходзілі, спалохаўшыся цяжкай працы ці нізкай зарплаты. Што ўтрымлівала вас у абранай прафесіі?***

— Сапраўды, выпадковыя людзі ў крымінальным вышуку не затрымліваліся. Калі чалавек чакаў нейкай рамантыкі, то гэта хутка выветрывалася, і ён сыходзіў. Заставаліся людзі, якія аддавалі сябе абранай прафесіі. Трэба ноч працаваць — значыць, працуем ноч. Трэба суткі напралёт — значыць суткі. Дадому прыйшоў, упаў, некалькі гадзін сну — і зноў за работу. Сем'і нас часам не бачылі. Але мы свядома працавалі ў такім рэжыме. Таму што было разуменне: кожнае злачынства павінна быць раскрытае, ад гэтага залежыць, без перабольшання, будучыня нашай краіны.

***— Зброю даводзілася выкарыстоўваць?***

— Мы зрывалі злачынцам іх буйны «бізнес». Яны ведалі пра тое, дзе мы працуем, дзе жывём. Напад можна было чакаць па дарозе дадому, на работу. Таму з пісталетам клаліся спаць і падымаліся. І пры затрыманні зброю выкарыстоўвалі. Часта толькі дэманстратыўна, як правіла, гэта спрацоўвала. Але здараліся і перастрэлкі, як гэта было, напрыклад, падчас блакавання злачыннай групы ў раёне вуліцы Кульмана. Усякае бывала! Але мне пашанцавала. Пры маім удзеле падчас затрыманняў ахвяр сярод асабовага складу не было.

***— Анатоль Іванавіч, вы з 2005 да 2008 года ўзначальвалі крымінальны вышук краіны. Вопыт у вас каласальны, і аператыўны, і кіраўніцкі. Скажыце, са з'яўленнем новай тэхнікі ці змянілася што-небудзь у рабоце вашага ведамства?***

— Так, вядома, змены ёсць. Перш за ўсё, шмат магчымасцяў далі новыя тэхналогіі. Напрыклад, намі з 2000-х сталі актыўна дастававаца з архіва і раскрывацца злачынствы мінулых гадоў. Былі створаны нават падраздзяленні па раскрыцці такіх спраў. Стала больш дасканалай і даступнай экспертыза па генетыцы. У 90-х гэта было дарагое і рэдкае абсталяванне, якое прымянялася ў адзінкавых выпадках па цяжкіх здарэннях. Але з надыходам 2000-х падобная тэхніка стала шырока выкарыстоўвацца, што дазволіла выкрыць многіх злачынцаў, на якіх раней не хапала доказнай базы.

Дзякуючы камп'ютару і праграмным прадуктам правапарушэнні пачалі раскрываць больш аператыўна. Тыя ж адбіткі пальцаў сталі ідэнтыфікаваць у разы хутчэй, чым гэта было раней. Так, тэхніка рушыла наперад, і гэта, безумоўна, вялікая дапамога для сышчыка. Ужо маладому пакаленню менш даводзіцца працаваць нагамі, як гэта было ў наш час, а больш займацца аналітыкай каля камп'ютара. Але ўсё роўна звычайную аператыўную работу ніхто не адмяняў. Калі трэба, супрацоўнік крымінальнага вышуку пакідае кабінет, ідзе да людзей і здабывае патрэбную інфармацыю. Так што наш вопыт і вопыт нашых папярэднікаў заўсёды спатрэбіцца.

***— Скажыце, якімі вачыма вы глядзіце міліцэйскія фільмы? І ці глядзіце іх наогул?***

— Бывае, — усміхаецца Анатоль Іванавіч, — асаблівa калі жонка глядзіць. Але сур'ёзна да іх не стаўлюся. Ёсць там доля праўды, але ўсё гэта больш мастацкая выдумка. Такога, каб у поўнай меры адлюстроўваць працу супрацоўнікаў крымінальнага вышуку, там, вядома, няма. У кіно злачынствы раскрываюцца напросту, адно за адным. У жыцці ж за раскрыццём кожнай справы стаіць велізарная, карпатлівая работа, і з фільмамі гэта не мае нічога агульнага ■

❍ У ТЭМУ

## ГОДНАЯ ПРАФЕСІЯ

**Міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Ігар ШУНЕВІЧ сустрэўся з найлепшымі маладымі супрацоўнікамі падраздзяленняў крымінальнага вышуку з усёй краіны.**



Мерапрыемства праходзіла ў музеі МУС. У Міністэрстве ўнутраных спраў даўно існуе традыцыя праводзіць цёплыя сустрэчы з былымі курсантамі міліцэйскіх ВНУ. Нагода для гэтага мерапрыемства была асаблівая — 100-годдзе з дня ўтварэння службы крымінальнага вышуку.

— Вы выбралі адну з самых годных прафесій, — адзначыў Ігар Шуневіч. — Пра гісторыю гэтага падраздзялення напісана нямала кніг. Таму не паляніцеся і ў найбліжэйшы час пачынайце збіраць асабістую бібліятэку. Успаміны былых сышчыкаў — сапраўдная скарбніца ведаў, якія не знойдзеш ні ў адным падручніку.

Кіраўнік МУС таксама ўспомніў пра першыя дні сваёй службы і прывёў паказальныя прыклады з уласнай практыкі. Ігар Шуневіч падкрэсліў, што крымінальны вышук моцны традыцыямі і пераемнасцю пакаленняў, і выказаў словы ўдзячнасці ветэранам службы, якія перадаюць маладым калегам бясцэнныя веды і вопыт.

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку (ГУКВ) МУС палкоўнік міліцыі Анатоль САКОВІЧ,** які таксама прыняў удзел у мерапрыемстве, адзначыў, што месца правядзення сустрэчы выбрана не выпадкова. Багатая экспазіцыя музея дапаможа вартавым парадку азнаёміцца з гісторыяй станаўлення службы, даведацца аб раскрыцці гучных злачынстваў розных гадоў. Анатоль Саковіч пажадаў маладым сышчыкам аператыўнай удачы, пасля чаго ўручыў ім нагрудныя знакі «За прафесійныя поспехі» і нядаўна надрукаваную кнігу, прысвечаную векавому юбілею крымінальнага вышуку.

## У СЫШЧЫКАЎ З'ЯВІЎСЯ СВЯТЫ ЗАСТУПНІК

**У Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, уручыў начальніку ГУКВ МУС палкоўніку міліцыі Анатолю Саковічу абраз заступніка службы Феадора Страцілата.**

З гэтай нагоды адбыўся малебен, на які сабраліся прадстаўнікі падраздзяленняў крымінальнага вышуку з усёй краіны.

Пасля заканчэння набажэнства прадстаяцель Беларускай праваслаўнай царквы ад імя ўсіх вернікаў павіншаваў сышчыкаў з надыходзячым прафесійным святам — векавым юбілеем службы.



— Праваахоўнікі, як і святары, беззапаветна служаць на карысць Айчыны і людзей, прысвячаючы гэтаму ўсе свае сілы і ўменні, — заўважыў мітрапаліт. — У цяжкія хвіліны на дапамогу заўсёды павінна прыходзіць шчырая вера ў Госпада, зварот да яго з малітвай. Я спадзяюся, што абраз святога велікамучаніка Феадора Страцілата, які перамагаў ворагаў, стане для вартавых парадку прыкладам для пераймання.

Анатоль Саковіч, у сваю чаргу, адзначыў, што за ўсю гісторыю службы супрацоўнікі крымінальнага вышуку ўпершыню атрымалі свайго святога заступніка. З такой ініцыятывай напярэдадні падрыхтоўкі да мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею, выступілі прадстаўнікі Беларускай праваслаўнай царквы.

— Гэта сведчыць аб тым, — дадаў Анатоль Саковіч, — што грамадства высока ацэньвае нашу працу. Святы заступнік падштурхне сышчыкаў усёй краіны на смелыя ўчынкі і самаадданую службу на карысць народу.

■ Профі

# «ХТО, ЯК НЕ Я»

## Такім дэвізам кіруецца оперупаўнаважаны Шыпкоў

**З выгляду Віктар ШЫПКОЎ — звычайны хлопец. Цывільнае адзенне, усмешка, простыя, дружалюбная манеры. Як гаворыцца, нічога асаблівага. Калі б не адна дэталь: кабура з пісталетам на поясе. А пісталет — гэта ўжо сур'ёзна. Пасада Віктара Уладзіміравіча Шыпкова — оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі аддзела ўнутраных спраў Гомельскага райвыканкама. Званне — старшы лейтэнант міліцыі. Узрост — 25 гадоў. Стаж працы ў падраздзяленні — тры гады. Няшмат, скажаце вы. А я вам адкажу: гэта па якіх крытэрыях мераць. Зрэшты, па парадку.**


Узнагарода з рук міністра.

### ПРАФЕСІЯ

Вядома, перш за ўсё я спытаў Віктара, чаму ён абраў такую прафесію? Няпроста, скажам прама. Вельмі спецыфічную і складаную. Што падштурхнула яго зрабіць такі выбар?

— Люблю пагоны, — адказвае з усмешкай Віктар. — У мяне і дзед, і прадзед служылі ў войску, былі афіцэрамі. Так што з дзяцінства да формы я прывык. Але танкі, самалёты мяне не вельмі прыцягвалі. Я люблю размаўляць з людзьмі. Таму, напэўна, і прыйшла думка пайсці служыць у міліцыю.

— Зносіны з людзьмі, — кажа оперупаўнаважаны Шыпкоў, — галоўнае ў працы сышчыка. І менавіта сышчыкам, калі спрасціць яго пасаду, ён і з'яўляецца. Вось, напрыклад, адна з самых першых яго спраў. У вёсцы абрабавалі адразу чатыры аўтамабілі. Злачынства здарылася ноччу, слядоў ніякіх няма, паспрабуй, як гаворыцца, знайдзі. Віктар пачаў распытваць сведак. Але апытанне спачатку нічога не дало. Ніякай наводкі або зачэпкі. Але малады сышчык, які толькі тады пачынаў, не здаваўся і працягваў пошукі. І вось у адной з гутарак мільганула слова «матацыкл». Нехта бачыў бы бачыў матацыкл, які праехаў па вёсцы ноччу. Віктар пацягнуў за гэтую нітачку — і ўдала. Ён кажа, інтуіцыя дапамагла. Знайшоўся неўзабаве і гэты таямнічы матацыкл, і яго ўладальнікі — два браты і іх сябрук. Спярша яны ўпіраліся і ўсё адмаўлялі, але, злоўленыя на рознагалоссях, «раскалоліся». Крадзеж быў раскрыты.

— Знайсці падыход да кожнага чалавека — вось што важна, — кажа Віктар. — Заўсёды ёсць той, хто штосьці бачыў або чуў. Але не заўсёды патэнцыяльны сведка адразу ўсё раскажа. Вось і трэба ўмець разгаварыць чалавека, схіліць яго да сябе, выклікаць яго давер. Тады будзе і вынік.

У ведамстве Віктара Шыпкова знаходзяцца тры сельскія саветы: Грабаўскі, Чарацянскі, Маркавіцкі. Гэта яго зона абслугоўвання. Тэрыторыя даволі вялікая, ды яшчэ і мяжа з Украінай побач. Па словах Віктара, акрамя звычайных крадзяжоў, асабліва на дачных участках, і разнастайных бытавых канфліктаў, былі ў яго практыцы і разбоі, і забойствы — усяго не раскажаш. І з усім даводзіцца разбірацца — такая работа.

Але старшы лейтэнант на работу не скардзіцца. Наадварот, кажа пра яе з гонарам і азартам — прызванне. Але разумее, што спецыфіка асаблівая, у якой мае месца так званая службовая дэфармацыя. Псіхічная нагрузка высокая, і не кожны без наступстваў для здароўя спраўляецца з ёй.

Спосаб абароны Віктара — сям'я і хобі, якому ён аддае ўвесь свой вольны час.

### СЯМ'Я

Ажаніўся Віктар на пятым курсе Акадэміі МУС. Да вяселля сустракаўся са сваёй будучай жонкай Веранікай некалькі гадоў — была магчымасць даведацца адно пра аднаго. І з дзецьмі цягнуць маладыя не сталі. І цяпер іх у сямействе Шыпковых трое. Хлопчык і дзве дзяўчынкі.

— Не шмат дзяцей? — пытаюся я. — Усё-такі вы людзі яшчэ маладыя, трэба ўстаць на ногі...

— Не, не шмат — усміхаецца Віктар. — Я люблю дзяцей, яны мне не перашкаджаюць. Наадварот, калі, бывае, забяруць да сябе старэйшых дзядуля і бабуля, дык вечарам нейк і сумна без іх, занятка няма чым.

— Дык можа, на трох не спыніцеся? — жартую я.

— Можа, і не спынімся, — смяецца Віктар.

Яго аптымізму толькі пазайздросціць. Жыве пакуль на здымнай кватэры, думаючы, вядома, аб будаўніцтве сваёй уласнай. Але цяжкасці не палохаюць. Наадварот, як мне здалося, ніякіх цяжкасцяў старшы лейтэнант міліцыі не заўважае. Жыве сабе і сваім блізкім у радасць, і іншым падае прыклад. Выдатны, трэба сказаць, прыклад.

І не толькі ў асабістым жыцці, але і ў грамадскім.

### ХОБІ

Цікавасць да роднай культуры з'явілася ў Віктара яшчэ ў дзяцінстве. Сам ён родам з вёскі, з тых самых Маркавічаў, якія ўваходзяць у зону яго прафесійных абавязкаў. Ад бабулі і прабабулі ён з малых гадоў чуў мноства казак, легендаў, песень. Запамінаў, сёе-тое з узростам і запісваў. Сам спрабаваў спяваць.

У школу да іх педагогам-арганізатарам прыйшоў Рыгор Ціханавіч Басаў. Гэта быў сапраўдны энтузіяст. Ён захапіў школьнікаў сваёй любоўю да народнай творчасці. Пад яго кіраўніцтвам вучні спявалі беларускія старадаўнія песні, развучвалі танцы, праводзілі абрады, знаёміліся з багатай традыцыяй сваёй зямлі. Віктар успамінае добрым словам свайго Настаўніка. Цяпер,


З гармонікам.

дарэчы, Рыгор Ціханавіч — святар, айцец Феадосій. Служыць у храме.

Там жа, у школе, Віктар пачаў іграць на гармоніку-двухрадцы. Падбіраў мелодыі на слых, самавук. Спачатку не ладзілася — не мог асвоіць басы. Потым усё атрымалася. Віктар стаў збіраць няспраўныя гармонікі і рамантаваць іх. Адзін час у яго калекцыю ўваходзіла аж 17 двухрадак. Потым ён амаль усе раздарыў: праслі сябры, знаёмыя, сваякі. Сабе пакінуў чатыры «майстравыя» гармонікі. Майстравыя — значыць, зробленыя пад заказ, адзінкава. Эксклюзіўна, як сказалі б цяпер. І выступае Віктар са сваімі эксклюзіўнымі пявучымі інструментамі на розных конкурсах, пачынаючы з вучобы ў Акадэміі, іграе ды спявае. Ды так паспяхова, што мае шэраг узнагарод і не збіраецца на гэтым спыняцца.

Акрамя музыкі, займаецца Віктар збіральніцтвам старажытных найгрышаў, прыпевак, песень. Апытвае старых людзей, запісвае на дыктафон, на відэа, проста ручкай у сшытак. І сам спявае гэтыя песні, якія дзіўным чынам захаваліся да нашых дзён.

Яшчэ Віктар Шыпкоў збірае старадаўняе адзенне і тканіны, бытавыя прылады, ганчарныя вырабы, разьбу


Сям'я ШЫПКОВЫХ.

па дрэве. Сабралася цэлая калекцыя, годная этнаграфічнага музея. Ён і выстаўляў свае скарбы — хай іншыя палюбуюцца. Так, выстаўкі праходзілі ў выставачнай зале абласнога цэнтра народнай творчасці ў Гомелі, у выставачнай зале Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, у аграгарадку Урыцкае, на Дні горада ў абласным цэнтры.

Акрамя таго, адзенне з калекцыі актыўна выкарыстоўваецца ў розных мерапрыемствах і святкаваннях. Адно з такіх, старадаўні абрад ваджэння «сулы», заслугоўвае асаблівай ува-


Віктар са сваёй калекцыяй.

гі, паколькі займае ў жыцці майго героя вельмі важнае месца.

### АБРАД «СУЛА»

«Сула» (рух, плынь) — гэта найстаражытнейшы беларускі абрад. Праводзіцца ён у Маркавічах, на другі дзень Вялікадня. Збіраецца ўся вёска, людзі апранаюць старадаўняе адзенне, водзяць карагоды, спяваюць песні. Мэта абраду — абудзіць зямлю для будучага ўраджаю. Яго аднаўленнем займаўся настаўнік Віктара, Рыгор Басаў. Але пасля таго, як ён змяніў род дзейнасці, правядзенне абраду ваджэння «сулы» пачалі з розных прычын адкладаць. І Віктар Шыпкоў вырашыў сваімі сіламі прадоўжыць традыцыю. Летась ён апрануў людзей у адзенне са сваёй калекцыі (сёе-тое жонка з яго сястрой дашывалі самі). Гасцей прыязджае нямала, ёсць і замежнікі. Сіламі маладога энтузіяста абрад не загас. Але Віктар разумее, што ў адзіночку ён доўга змагацца не зможа. Выхад знайшоўся — дапамаглі аптымізм майго героя і яго ўпартасць. Яшчэ з гадоў вучобы ў Мінску Віктар быў членам студэнцкага этнаграфічнага таварыства «СЭТ». З яго дапамогай сабраў дакументы, неабходныя для таго, каб прызнаць абрад «Сула» нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі. Такіх дакументаў сабрана ўжо таўшчэзная папка — сама па сабе немалая праца. Застаецца толькі аддаць яе ў адпаведныя інстанцыі і дачакацца рашэння. І Віктар перакананы, што цяпер унікальная традыцыя не згасне і навекі захаваецца ў народзе.

### ЧАС І МЕСЦА

Я не мог не спытаць у старшага лейтэнанта міліцыі Шыпкова, як начальства ставіцца да яго захапленняў?

— З разуменнем, — адказвае Віктар. — Свае прафесійныя абавязкі я выконваю добрасумленна, маё хобі рабоце не перашкаджае. А як мне здаецца, дык і дапамагае.

Яго словы пацвярджаюцца цэлым наборам падзяк і дыпломаў, якія красуюцца ў рамках на сцяне. І выдатная служба, і ўдзел у конкурсах, і збіранне старадаўніх прадметаў, і сям'я — усё ўваходзіць у распарадак дня старшага лейтэнанта, усяму знаходзіцца час і месца. Такое вось незвычайнае жыццё ў гэтага звычайнага з выгляду хлопца. І шчыра кажучы, я яму ад душы пазайздросціў.

— А навошта, калі не сакрэт, вы ўсё гэта робіце? — пацікавіўся я напрыканцы. — Цяжка ж... Ды і не кожны ацэніць.

— У мяне ёсць дэвіз, — адказаў Віктар, — «хто, як не я». Вось адпаведна гэтаму дэвізу я і жыву ■

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУЛАКОЎ.

■ Сугучча

**Алесь БАДАК:**

# «ГАЛОЎНАЕ — ПРАЗ КНІГУ ПРАДСТАВІЦЬ БЕЛАРУСЬ...»

**У сталіцы Туркменістана 2-3 кастрычніка пройдзе чарговая XII Міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Беларусь прадстаўляюць шэсць кніжных выдавецтваў і кнігагандлёвая арганізацыя «Белкніга». З кіраўніком беларускай дэлегацыі дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ гутарыць наш карэспандэнт.**



Фота Кастуся ДРОБАВА

***— Алесь Мікалаевіч, чым цікавы кніжны форум у Ашхабадзе для Беларусі?***

Жанчына па імені Мэл прызналася, што ў яе шлюбе з Марці ўсё было добра, пакуль яго кампанія не адкрыла дадатковы офіс у Канадзе. Мужчына тыднямі прападаў у камандзіроўках, і адносіны паміж сужэнцамі сапсаваліся. З часам муж пачаў гадзінамі сядзець у камп'ютары, а таксама казаў жонцы, што ў яго шмат работы, і не меў стасункаў з ёй. Аднойчы ён заснуў з ноўтбукам, і Мэл выявіла, што яму прыйшло паведамленне ад іншай жанчыны. З перапіскі яна зразумела, што Марці жыве з ёй у Канадзе, і яны плануюць пажаніцца.

Мэл вельмі раззлавалася і вырашыла адпомсціць. Як толькі яе муж з'ехаў у камандзіроўку, яна звярнулася да рыэлтараў з просьбай прадаць дом як мага хутчэй. Нерухомасць была запісаная на жанчыну. Сама Мэл адправілася ў круіз з сяброўкамі і не ведае, як адрэагаваў яе муж, калі прыехаў дадому і выявіў там іншых гаспадароў. З гэтага моманту Марці больш не звязваўся з жонкай і канчаткова пераехаў у Канаду. Мэл адзначыла, што вырашыла расказаць гэтую гісторыю не з гонару за свой учынак, а каб «надаць сіл усім падманутым жанчынам».

### Амерыканцы паляжаць у магілах дзеля грошай

**Парк забаў у амерыканскім горадзе Сент-Луіс узнагародзіць чалавека, які пратрымаецца 30 гадзін у труне, паведамляе Daily Mail.**



Спаборніцтва пройдзе 13 кастрычніка і прымеркавана да Хэлоўіна. Шэсць чалавек зачыняць у трунах. Супрацоўнікі парку будуць карміць удзельнікаў і адпускаць іх у прыбіральню, аднак адлучацца можна не больш чым на шэсць хвілін у гадзіну. У трунах маюцца зарадныя прылады для мабільнага тэлефона. Акрамя таго, у рабочыя гадзіны каля іх могуць знаходзіцца знаёмыя ўдзельнікаў. Пераможца атрымае 300 долараў, астатніх удзельнікаў узнагародзяць абанементамі на наведванне парку ў 2019 годзе і білетамі на атракцыёны. Акрамя таго, пасля завяршэння конкурсу яны змогуць забраць труны сабе.

**Іван КУПАРВАС**

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

**Лот № 1**. Капитальное строение с инв. № 731/С-8051 **(магазин)** площадью 112,7 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Климовичский р-н, г. Климовичи, ул. Железнодорожная, д. 16. Земельный участок с кадастровым номером 722850100001004039 площадью 0,0239 га.

**Начальная цена продажи: 24 360,00 бел. руб.**
**Сумма задатка: 2 436,00 бел. руб.**

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион состоится 31 октября 2018 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 30 октября 2018 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона |
| **Расчетный счет для внесения задатка** | Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X |

**Продавец:** ОАО «Автомотосервис и торговля-1» УНП 700012385, г. Могилев, Гомельское шоссе, 53в

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. 375 222 72-41-14

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лоты продаются без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 7 % от конечной цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +37544-767-65-36, +37529 550-09-56**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания магазина, общей площадью 490,9 кв. м, инв. № 630/С-74071, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623883505601000366 (предоставлен на праве аренды) площадью 0,1259 га, по адресу: Минская область, Молодечненский район, Полочанский с/с, аг. Полочаны, ул. Вокзальная, 7.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **28 563,94** бел. руб. **Стоимость снижена на 81 %.** Задаток 10 % от начальной цены – **2 856,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи объекта. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2018. Аукцион состоится **11.10.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.10.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

## ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-332622 площадью 60,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Зайцева, 67-3. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007001186 площадью 0,1037 га | **97 400,00** | **9 740,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 16 октября 2018 г**. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **18 октября 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещения в газете *«Звязда» от 29.09.2018 г.* |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 10 %. Цель использования – любая, кроме розничной торговли. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 3 (три) месяца. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано газете «Звязда» от 16.08.2018 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**

## Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 29 октября 2018 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) | Расходы по изготовлению документации (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | д. Чуденичи, ул. Бэзовая,11 кадастровый номер 623286308101000486 | 0,1180 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 8 000,00 | 800,00 | 1866,22 |
| 3 | аг. Острошицы, ул. Рябиновая, 12 кадастровый номер 623286306601000426 | 0,1702 | Новый район индивидуальной застройки. Имеются сети: электрификация, водоснабжение, газификация | 15 000,00 | 1500,00 | 220,50 (установление границ земельного участка за счет покупателя) |

**Дата, время и место проведения аукциона:** 29 октября 2018 в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Прием документов, ознакомление с участком и документацией:** ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 23.10.2018 включительно; к заявлению прилагаются квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет BY37AKBB36006191411050000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 600537220 код платежа – 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.

**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

**Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 366 76 48**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Ростэм»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Доля в уставном фонде общества с ограниченной ответственностью «Агрофирма Илья» в размере 100 % | Минская область, Вилейский р-н, д. Ободовцы | 6 989 000,00 | 69 890,00 | 349 450,00 |

В отношении лота проводятся первые торги. Окончание приема заявлений в 18.00 31.10.2018

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона, либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 02.11.2018 в 14.00 (регистрация участников с 13.40 до 13.55) по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19, пом. приемной**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY80ALFA30122215570140270000 в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом 02.11.2018 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

По вопросу ознакомления с предметом торгов обращаться по тел.: +375 (29) 365-06-97 (Екатерина Леонидовна).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: тел. 8 (029) 305-86-50 • e-mail: frondera@mail.ru**

## Извещение о проведении электронных торгов
## Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 30 октября 2018 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, на пересечении ул. Немиги и ул. К. Либкнехта | 500000000005008134 | 1,2908 | Для строительства объекта «Многофункциональный комплекс общественного назначения на пересечении ул. Немиги и ул. К. Либкнехта в г. Минске»/земельный участок для размещения объектов иного назначения | 733 585,52 | 110 000,00 | 12 326,33 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства многофункционального комплекса, состав объекта строительства – многофункциональный комплекс общественного назначения (административно-делового, культурно-развлекательного, спортивного, лечебно-оздоровительного, торгового назначения); объекты общественного питания; паркинг (по расчету); показатели по вместимости объекта строительства – до 62 000 кв. м |
| 2 | г. Минск, ул. Подлесная | 500000000001035059 | 0,1798 | Для строительства объекта торгового назначения по ул. Подлесной в г. Минске/ земельный участок для размещения объектов розничной торговли | 40 620,38 | 6 100,00 | 9 543,74 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: состав объекта строительства – торговый объект, открытые наземные парковки (назначение торгового объекта определяется архитектурно-планировочным заданием), показатели по вместимости объектов строительства – до 600 кв. м общей площади; возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 2328,11 рублей с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения |
| 3 | г. Минск, ул. Петра Глебки | 500000000006009160 | 0,3741 | Для строительства объекта «Детский развлекательный центр по ул. Петра Глебки в г. Минске»/ земельный участок для размещения объектов иного назначения | 144 735,51 | 21 700,00 | 10 484,07 | проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: функциональное назначение земельного участка и его частей – для строительства детского развлекательного центра в парке «Тиволи», состав объекта строительства – детский развлекательный центр; показатели по вместимости объекта строительства – до 1100 кв. м |

* Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения

Продавец: Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by.

Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 2261672, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

Порядок проведения электронных торгов: электронные торги проводятся в соответствии с регламентом информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу http://minskestate.by, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – 24.10.2018 г.

Дата и время начала проведения электронных торгов: 30 октября 2018 года в 11.30 (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, для проведения аукциона и представлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:

по земельному участку для строительства объекта «Многофункциональный комплекс общественного назначения на пересечении ул. Немиги и ул. К. Либкнехта в г. Минске» – 110 000,00 руб. (сто десять тысяч белорусских рублей);

по земельному участку для строительства объекта торгового назначения по ул. Подлесной в г. Минске – 6 100,00 руб. (шесть тысяч сто белорусских рублей);

по земельному участку для строительства «Детский развлекательный центр по ул. Петра Глебки в г. Минске» – 21 700,00 (двадцать одна тысяча семьсот белорусских рублей).

Прием заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 24.10.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» ( http://minskestate.by)

# ПОЯСАМ І ШЛЯХАМ

## Наколькі паспяховым аказаўся найбуйнейшы транснацыянальны праект?



**Канец верасня — адразу некалькі знакавых нагод, каб яшчэ раз згадаць Паднябесную. Паслязаўтра адзначаецца галоўнае дзяржаўнае свята Кітая — Дзень утварэння КНР. Менавіта 1 кастрычніка 1949 года на мітынгу на плошчы Цяньаньмэнь у Пекіне было абвешчана аб утварэнні Кітайскай Народнай Рэспублікі. У верасні 2013-га падчас дзяржаўнага візіту ў Казахстан старшыня КНР Сі Цзіньпін выступіў з ініцыятывай будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху», а ў кастрычніку ў Інданезіі ён заклікаў стварыць «Марскі Шаўковы шлях XXI стагоддзя». Чым аказалася адметная першая пяцігодка рэалізацыі найбуйнейшага глабальнага праекта сучаснасці?**

### ТРЫЛЬЁН ДОЛАРАЎ У ГОД

Паводле афіцыйных даных Кітая, «Адзін пояс, адзін шлях» ахоплівае большую частку Еўразіі, злучаючы краіны, якія развіваюцца, у тым ліку так званыя новыя эканомікі, і развітыя краіны. На тэрыторыі мегапраекта сканцэнтраваны багатыя запасы прыродных рэсурсаў, пражывае 63 працэнты насельніцтва планеты, а меркаваны эканамічны маштаб вылічваецца дзясяткамі трыльёнаў долараў.

На сімпозіуме ў гонар пяцігоддзя абвяшчэння ініцыятывы Сі Цзіньпін заявіў, што сумеснае будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» адпавядае патрабаванням рэформаў сістэмы глабальнага кіравання. У гэтым працэсе адлюстроўваецца канцэпцыя супольнасці адзінага лёсу. Глабальная канцэпцыя атрымала падтрымку больш за 100 краін свету і міжнародных арганізацый, якія актыўна прасоўваюць яе рэалізацыю. Паводле інфармацыі начальніка дзяржаўнага статыстычнага ўпраўлення Ніна Цзічжэ, якую агучыла «Жэньмінь жыбаа» анлайн», сукупны тавараабарот Кітая з краінамі-ўдзельніцамі гэтай ініцыятывы перавысіў пяць трыльёнаў долараў (атрымліваецца фактычна трыльён у год), а аб'ём прамых інвестыцый перавысіў 70 мільярдаў долараў. Штогадовы прырост склаў 7,2 працэнта, аб'ём новых заключаных дагавораў перасягнуў 500 мільярдаў долараў. За пяцігодку ў краінах уздоўж Шляху было створана звыш 240 тысяч новых рабочых месцаў.

«У той жа час мы пашыраем сферы для замежнага капіталу, ствараем высокія ўмовы для бізнесу, прыцягваем інвестыцыі з краін уздоўж «Пояса і шляху», — заўважыў намеснік міністра камерцыі Кітая Цянь Кэмін. За пяць гадоў кітайскія прадпрыемствы ў краінах уздоўж «Пояса і шляху» пабудавалі 82 гандлёва-эканамічныя зоны, у якія «засяліліся» 3995 прадпрыемстваў. Будаўніцтва гэтай актыўнай сеткі бесперапыннна пашыраецца. Кітай падпісаў або вывеў на больш высокі ўзровень пяць пагадненняў аб свабодным гандлі з 13 краінамі ўздоўж «Пояса і шляху». У шэрагу праектаў дасягнуты істотны прагрэс.

Нін Цзічжэ адзначыў, што Кітай актыўна развівае супрацоўніцтва ў сферах адукацыі, навукі. Дзякуючы ўвядзенню стыпендыі «Шаўковы шлях» і стварэнню навучальных устаноў за мяжой, магчымасць прайсці падрыхтоўку атрымалі тэхнічныя і кіраўніцкія кадры. Летась у Кітай з краін уздоўж «Пояса і шляху» прыехала больш чым 300 тысяч студэнтаў, а з КНР адправілася 60 тысяч. Мяркуецца, што да 2020 года колькасць турыстаў у гэтых дзяржавах перавысіць 85 мільёнаў чалавек, а агульны абарот гэтай сферы складзе 110 мільярдаў.

«Аналізуючы мінулае, мы павінны разумець, што Вялікі шаўковы шлях служыў не толькі гандлёвым шляхам. Ён адыграваў ролю дарогі сяброўства, якое бесперапынна ўмацоўвае гуманітарныя абмены паміж рознымі краінамі. Нельга адмаўляцца ад далейшага асваення і падаўжэння гэтага шляху, бо нашы продкі даўно ўжо адзначылі яго важнасць», — сказаў намеснік гендырэктара Медыякарпарацыі Кітая Ху Баншэн.



### БЕЗ «ЗАКОНУ ДЖУНГЛЯЎ»

«Адзін пояс, адзін шлях» ужо стаў брэндам», — сказаў дырэктар НДІ міжнародных спраў Народнага ўніверсітэта Кітая Ван Івэй у інтэрв'ю «Жэньмінь жыбаа». Ініцыятыва ўключана ў рэзалюцыі ААН і атрымала шырокае прызнанне міжнароднай супольнасці. Адзначаецца, што яна актыўна садзейнічае спалучэнню стратэгій развіцця з рознымі краінамі і стварае новую мадэль эфектыўнага супрацоўніцтва. «Адзін пояс, адзін шлях» актыўна звязаны з планамі развіцця АТЭС, АСЕАН, АС, Еўразійскага эканамічнага саюза, ЕС і рэгіёна Супольнасці краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна.

У заходняй прэсе — мноства ацэнак праекта. Лаўрэат Нобелеўскай прэміі па эканоміцы, прафесар Нью-Ёркскага ўніверсітэта Томас Сарджэнт адзначыў: «Ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» прынясе выгаду не толькі Кітаю, але і ўсяму свету. Яна прывядзе да новага этапу і новай якасці канкурэнцыі, што будзе не толькі стымуляваць развіццё глабальнай эканомікі, але і падштурхне чалавецтва на генерацыю новых ідэй ва ўсіх кутках свету».

Як заўважае Bloomberg Markets (BM), калі амбіцыйныя планы Сі Цзіньпіна ўвасобяцца ў рэальнасць, Пекін устане на чале новага эканамічнага сусветнага парадку, які ахоплівае больш за палову зямнога шара. Арэол уплыву КНР сёння нашмат большы, чым у імперыі Тан часоў залатой эпохі, якая існавала тысячу гадоў таму, адзначае выданне. «Адзін пояс, адзін шлях» — гэта «асаблівы палітычны соус: калі вы дадасце яго да чаго заўгодна, страва стане смачнейшая», — прыводзіць Bloomberg Markets меркаванне Майкла Эверэ, кіраўніка аддзела даследаванняў фінансавых рынкаў Rabobank Group у Ганконгу. Пасля набыцця статусу новага Шаўковага шляху праект пратачыўся ў месцы, дзе ніколі не праходзілі старажытныя караваны, заўважае BM. Сёлета ён дабраўся да Паўднёвай Афрыкі, Карыбскіх астравоў і нават да Арктыкі, а нядаўна ўзняўся ў космас. Пекін заявіў, што краіны, якія ўдзельнічаюць у праекце, будуць першыя ў чарзе на падключэнне да паслуг новай кітайскай сістэмы спадарожнікавай навігацыі.

Большасць запланаваных аперацый накіраваны на развіццё інфраструктуры. Пры гэтым большасць замежных інвестыцый пазначаныя як неад'емная частка вялікага шляху: грузавы цягнік у Тэгеран з насеннем кітайскіх слачэннікаў, новы будынак суда ў Папуа — Новай Гвінеі і арашальная сістэма на Філіпінах. Глабальная сетка гандлёвых шляхоў, уключаючы Эканамічны пояс Шаўковага шляху і праект Марскі Шаўковы шлях, працягвае пашырацца.

Як азначыў Сі Цзіньпін, «Адзін пояс, адзін шлях» — гэта ініцыятыва эканамічнага супрацоўніцтва, а не ідэя стварэння геапалітычнага альянсу або ваеннага саюза. Яе ажыццяўленне з'яўляецца адкрытым і інклюзіўным працэсам і не мае мэтай фарміраванне эксклюзіўнага блока або «Кітайскага клуба». Акрамя таго, гэта ініцыятыва не падзяляе краіны па ідэалогіі і не з'яўляецца «гульнёй з нулявой сумай». Калі краіны жадаюць да яе далучыцца, мы іх вітаем». Адсюль відаць, што Кітай не ўхваляе «закон джунгляў», калі «моцны пажырае слабага», у адпаведнасці з якім праводзяць палітыку некаторыя краіны».

### РЭАЛЬНА ПРАЦУЕ!

Даследаванне групы AidData сведчыць аб тым, што ў свеце з'яўляецца фінансавы гігант, які кідае выклік нават самым буйным краінам-донарам, перадае Forbes. Пры гэтым спецыялісты дакладна высветлілі, што кітайская практыка аказання дапамогі не носіць ашуканскі і накіравальны характар, як пра яе кажуць многія. У перыяд з 2000 па 2014 гады Кітай афіцыйна выдзеліў фінансаванне ў розных краінах свету на суму 354,4 мільярда долараў. Гэта вельмі блізка да таго аб'ёму, які за той жа перыяд часу выдзелілі Злучаныя Штаты — 394,6 мільярда долараў. У некаторых краінах гэтыя дзве дзяржавы падобныя на канкурэнтаў, і Кітай часам робіць замах на амерыканскае першынство, становячыся вядучым донарам, адзначае Forbes. Як лічыць прафесар амерыканскага цэнтра энергетыкі і ўстойлівага развіцця Волкан Эдыгер, у аснове цяперашняй эканамічнай вайны, развязанай ЗША, ляжыць менавіта праект «Адзін пояс, адзін шлях». «Амерыка будзе рабіць усё магчымае, каб парушыць рэгіянальнае супрацоўніцтва і перашкаджаць стварэнню праекта», — упэўнены Эдыгер.

У сваю чаргу Еўрапейскі саюз вылучыў ідэю павелічэння аб'ёмаў інвестыцый у Азію і развіцця інфраструктуры рэгіёна, якая можа канкураваць з кітайскай ініцыятывай «Адзін пояс, адзін шлях», адзначае South China Morning Post. Як паведаміла выданне, інвестыцыі ЕС у Азію могуць павялічыцца ў чатыры разы, што ўзмоцніць прысутнасць Еўрасаюза ў рэгіёне, які, паводле ацэнак, мае патрэбу ва ўкладаннях у інфраструктуру ў памеры 1,5 трыльёна долараў у год. З іншага боку, як заўважаюць спецыялісты, сёння заходнія інстытуты развіцця завязлі ў бюракратыі і ацэнках рызык, губляючы час і грошы. Кітай жа запаўняе свабодныя нішы і ўходзіць дамінуе. Пра гэта піша Фрэнсіс Фукуяма, аналітык, амерыканскі палітолаг, аўтар фундаментальнай працы «Канец гісторыі». Як ён заўважае, заходнія палітыкі ўсур'ёз занепакоеныя тым, што ініцыятыва кітайскага кіраўніцтва «Адзін пояс, адзін шлях» карэнным чынам зменіць геапалітычны ландшафт свету на сваю карысць. Маштаб кітайскіх інвестыцый беспрэцэдэнтны ў сусветнай гісторыі. Прычым першынство ў сферы эканомікі Захад добраахвотна саступіў КНР, лічыць Фрэнсіс Фукуяма. Эфектыўнасць глабальнай ініцыятывы прызнаюць многія. Як заўважае Forbes, «Адзін пояс, адзін шлях» пабудаваны такім чынам, што ён рэальна працуе!

І яшчэ. Беларусь не засталася ўбаку ад рэалізацыі найбуйнейшага трасанцыянальнага праекта. Як чакаецца, да канца гэтага года колькасць рэзідэнтаў Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» складзе не менш чым чатыры дзясяткі. Акрамя таго, як расказаў кіраўнік парка Аляксандр Ярашэнка, да 2020 года тут плануюць стварыць 6,5 тысячы працоўных месцаў, а агульны аб'ём інвестыцый да гэтага часу перавысіць два мільярды долараў. Лічбавізацыя «Вялікага каменя» як вузлавой платформы Шаўковага шляху дазволіць удвая скарацiць шлях з Кітая ў Еўропу. Паводле інфармацыі Аляксандра Ярашэнкі, у чэрвені 2019 года на базе парка запланавана правядзенне міжнароднага форуму «Адзін пояс — адзін шлях».

Як заўважыў днямі пасол КНР у Беларусі Цуй Цымін на ўрачыстым прыёме з нагоды 69-годдзя ўтварэння КНР, падчас сумеснай рэалізацыі ініцыятывы «Пояс і шлях» усебакова прасоўваецца супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю ва ўсіх абласцях, паміж дзвюма краінамі ўсталявалася ўсебаковае стратэгічнае партнёрства, якое характарызуецца ўзаемным даверам і ўзаемавыйгрышным супрацоўніцтвам. Адметна, што выступаў дыпламат на беларускай мове.



**Захар БУРАК.**

# А Ў ХАЦЕ ВЯСЕЛЛЕ



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 3.** «Жаніцеся, дзецюкі,//Я не ваша... ://Яшчэ замуж не пайду,//Яшчэ маладзенька». *Прыпеўка.* **8.** «Ой, дзеўкі, бяда://За каго я выйшла !//Ні каровы, ні каня //... чупрына пышна». *Прыпеўка.* **9.** «А ў нашага свата//Кругом хаты ..., //Кругом хаты зелле, //А ў хаце вяселле». *Прыпеўка.* **10.** Узаемнае наведванне бацькоў маладых, якое адзначаецца на дзявяты дзень пасля вяселля. **13.** Нізкая гліняная пасудзіна. **14.** «Раздумаўся ...//Ды ў далоні плешча:// — Калі буду жыў-здаров//Ажанюся ешча!». З беларускай народнай песні «У месяцы верасні». **15.** Жывапіс на бытавыя тэмы. **16.** Баба скача, а ... плача *(прык.)*. **17.** Беларуская багіня, апякунка шлюбаў. **18.** ... і дождж на вясельны поезд — багата жыць *(прыкм.)*. **19.** Інертны газ. **21.** Абдымкі — найлепшыя ... *(прык.)*. **22.** Травяністая расліна, падземныя парасткі якой ужываюцца ў ежу. **25.** Электрод з дадатным зарадам. **26.** Вялікая ... . Назва на Беларусі перыяду ад Багача (21 верасня) да Піліпаўкі (28 лістапада), калі прапаноўвалася рабіць вяселлі. **28.** Аўтаматычны механізм для замыкання і размыкання электрычнага ланцуга. **29.** Увосень за ... просім *(прык.)*. **30.** «Каб жыццё , як ..., не круцілася, //Каб на радасць было вам яно». З верша А. Куляшова «Вяселле».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Ля нашых варот заўсёды ... *(прык.)*. **2.** Конская хвароба. **4.** Дастаўка па прызначэнні. **5.** Будынін для дробнага гандлю. **6.** Газеты, часопісы, тэлебачанне, інтэрнэт...; усё разам *(абрэв.)*. **7.** Вяселлю казала і ... гуляць ад нядзелі да чацвярга *(прык.)*. **11.** «А ...,//А ...//Едзе з песняй да сяла». З песні «Ой, мяцеліца» (сл. А. Дзеружынскага, муз. М. Шуміліна). **12.** «Як ..., маладая,//Хоць ты малюй на абразы». З верша Я. Мальца «Вясковае вяселле». **18.** Азотнае ўгнаенне. **20.** На тое і ..., каб спраўлялі вяселлі *(прык.)*. **23.** Якое семя, такое і ... *(прык.)*. **24.** «А божа мой, божа мілы,//Нашто я жаніўся?//Узяла ... ўкусіла -// Тры гады лячыўся». *Прыпеўка.* **26.** «Няхай ... вам не ўбывае//У жыцці сонца, кветак». З верша Я. Купалы «Маладым на вяселлі». **27.** Орган размнажэння ў грыбоў.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**

*г. Дзяржынск.*

**Правэрце, калі ласка, адказы:**

**Па гарызанталі: 3.** Дзеўка. **8.** Адна. **9.** Мята. **10.** Падвясёлкі. **13.** Гляк. **14.** Дзедка. **15.** Жанр. **16.** Дзед. **17.** Лада. **18.** Снег. **19.** Неон. **21.** Лекі. **22.** Спаржа. **25.** Анод. **26.** Вясельніца. **28.** Рэле. **29.** Стол. **30.** Вятрак.
**Па вертыкалі: 1.** Карагод. **2.** Сап. **4.** Завоз. **5.** Кіёск. **6.** СМІ. **7.** Качарга. **11.** Вяселейка. **12.** Каралеўна. **18.** Салетра. **20.** Нядзелі. **23.** Племя. **24.** Жонка. **26.** Век. **27.** Аск.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.07 | 18.51 | 11.44 |
| Віцебск — | 6.57 | 18.40 | 11.43 |
| Магілёў — | 6.57 | 18.41 | 11.44 |
| Гомель — | 6.53 | 18.38 | 11.45 |
| Гродна — | 7.23 | 19.07 | 11.44 |
| Брэст — | 7.23 | 19.08 | 11.45 |

### Месяц

*Поўня 25 верасня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

### Імяніны

*Пр. Людмілы, Віктара, Іосіфа, Рыгора.*
*К. Міхаліны, Міхала.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +13..+15°С | КІЕЎ +11..+13°С | РЫГА +11..+13°С |
| ВІЛЬНЮС +12..+14°С | МАСКВА +10..+12°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +9..+11°С |

## Даты. Падзеі. Людзі

### 29 ВЕРАСНЯ

**У краіне**

**1823** год — нарадзіўся (вёска Смольгава, цяпер у Любанскім раёне) Уладзіслаў Сыракомля (Людвік Кандратовіч), беларускі і польскі паэт. Вучыўся ў дамініканскіх школах у Нясвіжы і Навагрудку. У 1841—1844 гадах працаваў у Нясвіжскай канцылярыі па кіраванні памешчыцкімі маёнткамі. За ўдзел у антыўрадавых маніфестацыях у 1861 годзе быў зняволены ў віленскую турму. Друкавацца пачаў у 1844 годзе. Асноўны кірунак творчасці — тэма бацькоўшчыны за вызваленне сялянства ад прыгону. Першы друкаваны твор «Паштальён» у перакладзе Л. Трэфалева стаў тэкстам рускай народнай песні «Ямщик». У. Сыракомля вывучаў гісторыю, этнаграфію, фальклор, мову беларусаў. Быў першым крытыкам новай беларускай літаратуры. Шырока выкарыстаў элементы беларускага фальклору, апрацоўваў і перакладаў беларускія народныя песні. Аўтар «Кароткага даследавання мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі», гісторыка-краязнаўчай працы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», шматлікіх вершаў. Памёр у 1862 годзе.



**1908** год — нарадзіўся (г. Пінск) Пётр Юльянавіч Корбут, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. У Чырвонай Арміі з 1931 года. Скончыў Арлоўскую бранятанкавай школу і Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі Чырвонай Арміі. З чэрвеня 1941-га — на Заходнім, Паўднёвым, 4-м Украінскім франтах. Са жніўня 1943-га — камандзір танкавай брыгады. Асабліва вызначыўся ў лютым 1944 года ў баях на Нікапальскім плацдарме. Танкавая брыгада пад яго камандаваннем прарвала абарону ворага, знішчыла 6 танкаў, 12 самаходных артылерыйскіх установак, 47 гармат, 79 кулямётаў, 22 аўтамашыны праціўніка, 310 гітлераўцаў. За гэтую аперацыю брыгада ўдастоена ганаровай назвы «Нікапальская». Загінуў у баі ў 1944 годзе.

**1943** год — ЦК КП(б)Б зацвердзіў прапанову Мінскага падпольнага абкама партыі аб стварэнні Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б. Новы падпольны цэнтр базіраваўся ў партызанскай зоне пры спецатрадзе НКДБ СССР «Мясцовыя» (камандзір Ваўпшасаў). Прапагандысцкую, дыверсійную і разведвальную дзейнасці падполля ў горадзе накіроўваў праз сувязных.

**1943** год — вызвалены горад Крычаў Магілёўскай вобласці. У вызваленні ўдзельнічалі 369-я стралковая дывізія 46-га стралковага корпуса 50-й арміі Бранскага фронту і часці 10-й арміі Заходняга фронту.

**У свеце**

**1829** год — у Лондане сэрам Робертам Пілем была сфарміравана і пачала дзейнічаць грамадзянская паліцыя Вялікага Лондана, якая пасля атрымала назву Скотланд-Ярд. Першапачаткова яе штат налічваў 1000 супрацоўнікаў, якія абслугоўваюць тэрыторыю ў радыусе сямі міль, на якой тады пражывала два мільёны чалавек. Назва Скотланд-Ярд пайшла ад першапачатковага месцазнаходжання штаб-кватэры паліцыі на вуліцы Вялікі Скотланд-Ярд ва Уайтхоле. У гэтым раёне некалькі стагоддзяў да таго размяшчаліся місіі шатландскіх каралёў, а двор, які ўтвараўся некалькімі вуліцамі, атрымаў назву «Шатландскі двор» — Скотланд-Ярд.

**1843** год — нарадзіўся Міхаіл Дзмітрыевіч Скобелеў, вядомы рускі ваенны дзеяч, генерал ад інфантэрыі. У Руска-турэцкую вайну 1877—1878 гадоў паспяхова камандаваў атрадам пад Плеўнай, затым дывізіяй у бітве пры Шыпцы-Шэйнаве. Прызнаны народным героем Балгарыі. Памёр у 1882 годзе.

## УСМІХНЕМСЯ

**Планы на лета: пачаць бегаць раніцай, сесці на дыету, з'ездзіць на мора, завязаць курортны раман. Як гэта — канец верасня?..**

— Дзядуля, вы выхоўваеце ўнука?
— Так.
— А ён мацюкаецца.
— Дык ён і пайшоў рана.

**Калі я вучыўся ў школе, у мяне быў толькі адзін рэпетытар — папруга!**

Што на самай справе значаць словы ў турагенцтвах.
Люкс — стандарт.
Стандарт — без кандыцыянера.
Эканом — турыстычны інтэрнат.
Атмасфера XVIII стагоддзя — прыбіральня на вуліцы.

**Выпрабавальнік тэлевізараў уладкаваўся яшчэ і выпрабавальнікам канап і цяпер працуе на дзве стаўкі.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3453.
Нумар падпісаны ў 19.30 28 верасня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12